# Адгрымела вайна, настаў мірны час

KAMUNIKAT.org

## Міхал Высоцкі, ХАНЬКІ:

Хадзілі рускія партызаны, хлеб прасілі, вопратку. Аднойчы папрасілі каня, паехалі, але рана бацька пайшоў на пашу, а наш конь ужо там хадзіў. Хаваліся яны ў зямлянках і так іх зацягалі, што не пазнаць было. Але траіх партызанаў раз немцы забілі.

Рускія наступалі з Сабятына на Валкі, на конях ехалі, прасілі коней, калі ў іх які слабы быў. У савецкае наступленне наша вёска таксама не пацярпела.

## Аляксандр Зінчук, БАЦЮТЫ:

Калі набліжаўся фронт, баўэра забралі ў апалчэнне. Гаспадыня выехала, і зараз саветы дагналі; яна паехала, а я вярнуўся ў маёнтак — стадола і абора ўжо былі спалены.

Мяне саветы на дарозе запынілі і ў зборны пункт забралі і дапытвалі; я не меў дакументаў. Калі не так адазвешся, то пад сцяну і трэба было так танцаваць, як гралі. Мяне аднаго цэлую ноч дапытвалі чатырох палітрукоў: пасля кожнага допыту было паўгадзіны адпачынку і чарговы допыт. І хто памыліўся, то і ўсё!

Мяне забралі ў вайсковы пункт, у лазню, абмундзіравалі. Хто раней у войску быў, таго ўжо на трэці дзень забіралі на фронт, а навічкоў падвучвалі. Два тыдні я ў Гумбінен вучыўся, дакладна пазнаёміўся з ружжом і гранатамі. Пасля забралі ў Ольштын, дзе размяркоўвалі і развозілі самаходамі ў франтавыя роты.

Мой батальён паехаў у Пілаў, а я астаўся ў Ольштыне, бо захварэў запаленнем лёгкіх і паўтара месяца ў шпіталі ляжаў; у той час кончылася вайна. 25 лістапада 1945 года маю часць вывезлі самаходамі ў Бабруйск; там у зямлянках запасны полк стаяў. Пасля трапіў у Добруш, а далей у Слуцк.

Дэмабілізавалі мяне 13 студзеня 1947 года. На праваслаўны Новы год заехаў я ў Ваўкавыск, да знаёмых, што туды з Бацют выехалі. Ад 14 студзеня да 24 лютага

ў Ласоснай чакаў загрузкі эшалона. Раніцай выехаў з Ласоснай, а вечарам быў ужо на радзіме. Перанача-ваў у хроснага, а раніцай у Бацюты прыйшоў, у нашай ха-це голыя сцены... Жыў у ёй пагарэлец, якому хата зга-рэла калі праходзіў фронт. І так мы сталі жыць разам, па-куль той на сваім буду паставіў. Так жылі мо з два гады, на адной пліце варылі.

### Уладзімір Кудзін, ХІЛЬМОНЫ:

18 ліпеня 1944 года звербавалі мяне на чыгунку. Прыехаў да нас чалавек з Кузніцы і арганізаваў рух. На-браў нас чатырох чалавек да аховы чыгункі: двух нас з Хільмонаў было, двух з Дубасна і двух з Новага Двара. Камендантам назначылі Уладыслава Равінскага з Но-вага Двара. Два тыдні нас абучалі савецкія афіцэры, якія мабыць прыязджалі з Сувалкаў і зараз мы сталі на пра-цу. Пасля, 8 верасня 1944 года ў Сувалках мы далі пры-сягу каля разбітага яшчэ касцёла. Далі нам ружжо і мы пільнавалі моста каля Гарасімаўцаў — таго, каля якога згінуў Кунавін.

Той мост на Сідры немцы мо якія два тыдні перад на-дыходам саветаў узарвалі; узарвалі таксама мост у Ка-раліне. З восені саветы сталі звозіць драўніну для адбу-довы моста і як рушыў фронт за зіму яго адбудавалі і з та-го часу пайшлі паязды на фронт; транспарты ішлі пера-важна ноччу.

Мы пільнавалі адрэзак ад граніцы да Вострава. Па-сажырскага руху ўжо не было; хадзілі толькі дрызіны і са-вецкія франтавыя паязды. Пасля вайны яшчэ некалькі эшалонаў збожжа — жыта і ячменю — прывезлі ў Камен-ную і яно там асталося; сяляне прыязджалі фурманкамі і забіралі яго. Пасля гэтую чыгунку зусім закрылі.

Каля 1950 года знялі рэйкі. Падходзілі дрызіны, зні-малі на іх рэйкі і адпраўлялі ў Аўгустаў. А мост пасля ку-піў Яўген Ганчарук з Хільмонаў і хату з яго сабе паставіў за вёскай; тая хата і сёння там стаіць. Многа было бяр-

вення, бо мост вялікі быў.

Да вайны з Новага Двара ў Гродна — было гэта 19 кіламетраў — часта ездзілі, бо ў Гродне радня была. І пад немцамі рух пасажырскі ў Гродна быў. У Гродне ў панядзелкі рынак быў, то мы ў нядзелю пад вечар туды ехалі і ў цёткі начавалі. Пасля вайны наша радня на гэты бок граніцы перасялілася. І калі стала граніца, то сталі ў Саколку фурманкамі ездзіць, бо тут павет быў. У Беласток да вайны не ездзілі, бо там ніякіх спраў не афармлялі. А цяпер у Беластоку нашы дзеці.

## Канстанцін Масальскі, БЕЛАСТОК:



Дзень свабоды пачаўся для мяне ў Фальварках з разбуджэння бацькам наступнымі словамі: „Выходзьце, бо ўжо прыйшлі савецкія салдаты". Побач нашага сховішча праходзіла разведачная група байцоў. Было гэта раніцай 22 ліпеня 1944 года. Калі мы дайшлі дадому, пабачылі салдат, якія мыліся ля студні. Запыталі яны маці, ці можа яна прыгатаваць ім „кіпяток". Мама прыгатавала ім не толькі кіпень, але і яешню. Папярэдзілі яны бацькоў, каб не дазвалялі дзецям браць невядомыя прадметы, якія маглі аказацца мінамі–пасткамі. Падсілкаваўшыся, салдаты падаліся ў напрамку вёскі Фальваркі–Тыльвіцкія, аддаленай ад нашай калёніі каля кіламетра. Некалькі гадзін пазней з'явіліся ў нас два салдаты з пытаннем ці можна ў нас закватараваць камандзіра. Бацька згадзіўся і адвёў яму адзін пакой. Паставілі яны два палявыя тэлефонныя апараты, правады ад якіх пацягнулі ў бок Тапалянаў і Фальваркаў–Тыльвіцкіх.

Камандзір, прыбыўшы да нас, выкупаўся ў катле ёмістасцю ў 200 літраў (у 1941 г. у ім варылі ежу савецкім салдатам). Маці яму таксама падрыхтавала харчаванне, але ён адмовіўся і паведаміў, што бярэ нашу сям'ю

на салдацкі паёк. Былі гэта згушчаныя мясныя супы з макаронамі, крупой, бульбай, купустай.

Да камандзіра часта прыходзілі афіцэры і салдаты. З размоў з імі бацька ведаў, што фронт спыніўся ў Заблудаве. Царкоўная і касцельная вежы выкарыстоўваліся ў якасці назіральных пунктаў для каардынацыі артылерыйскіх дзеянняў. Пры Фальварках–Тыльвіцкіх былі размешчаны дзве „кацюшы". Мне ўдалося пераканаць камандзіра і бацькоў, каб мне паказалі „кацюшу". Пасля адыходу фронту на месцы „кацюшаў" была спаленая зямля. З іх выстралілі дзве серыі ракетаў. У выніку змаганняў за Заблудаў засталіся дзіры ў даху царквы і сцяне касцёла.

Калі ў мяне на сцягне зрабілася скула і я стаў плакаць, камандзір выклікаў урача і той яе разрэзаў. Калі я расплакаўся ад болю, лекар сказаў мне: „Сынок, не плач. Падумай, нашы байцы пераносяць не такі боль у імя свабоды". Прыходзіла да нас санітарка, якая рабіла мне перавязкі. Праз нейкі час камандзір развітаўся з бацькамі, а нас узяў на рукі і пацалаваў.

Некалькі дзён пазней у Тыльвіцкім лесе дыслацыравалася савецкая ваенная часць, адкліканая з фронту для папаўнення і абучэння навабранцаў. Салдаты наведвалі навакольных сялян. Запомніліся мне прыгожыя „дзевушкі" ў афіцэрскіх ботах, у адрозненні ад салдат у кірзавых сапагах. З іх лагера даносіліся песні пад акампанемент баяна. Салдаты частавалі нас цукеркамі. Спазнаў я і смак „свіной тушонкі".

Пасля ад'езду камандзіра пайшоў я ў раён нямецкіх акопаў, дзе пабачыў шмат усялякай амуніцыі.

Пасля адыходу фронту савецкія салдаты рэквізавалі ў нас ялавіцу, а былі ў нас толькі тры каровы. Далі яны нам квітанцыю і паведамілі, што ў будучым атрымаем кампенсацыю. На вясковым сходзе бацька даведаўся, што могуць быць выпадкі падмены коней, якімі на калясках падвозяць на фронт амуніцыю.

**Рыгор Місюк, ЯЦЭВІЧЫ:**

Як саветы наступалі, то між Плютычамі і Дэніскамі разгарэліся баі. За нашай клуняй двух забітых немцаў пахавалі. Мы ім там магілку насыпалі, кветкі паклалі, крыж бярозавы паставілі. А як уварваліся саветы, то тую магілку раскідалі, растапталі. І пасля тою магілай ніхто не займаўся, так косці тых немцаў ляжаць там па сённяшні дзень.

Як гналі немцаў, то саветы панапіваліся, пабіліся і адзін другога фінкай трапіў у плечы і забіў. Труп завезлі ў Лапцi і там пахавалі, а пасля таго забойцу судзілі, людзей з нашай вёскі на сведкаў бралі.

Гарэлку рускія мелі з абмену або абману. Адзін каня брату прадаваў за гарэлку: гарэлку забраў, а каня не даў, толькі прыгразіў. А наша вёска ўцалела, толькі як немцы наступалі і адступалі, то па адным нашым чалавеку загінула. Адступаючыя немцы ўзарвалі чыгуначны мост на Нарве, але саветы адразу сталі будаваць аб'язны драўляны мост, па якім неўзабаве пайшлі эшалоны, па два ў суткі, іх у Бельску разгружалі і шашою праз Браньск адпраўлялі тэхніку на фронт.

**Аляксандр Мусько, ДУБНА:**

Папрасілі мы лекара, ён нас скіраваў на камісію і камісія нас звольніла з арміі. 13 снежня 1945 года далі нам абходныя лісты і ў тры гадзіны пасля абеду мы ўжо былі вольныя. У сем гадзін вечара селі ў поезд у Маскву, а з Масквы прыехалі ў Брэст.

У сябраў дом зайшлі вечарам, ужо было цёмна. Нікога няма, мы селі. Прыйшла сябрава жонка, ён змененым голасам пытае, ці пераначуе нас.

— Нікога не начую, — адказвае яна, — бо мужа няма.

— А дзе ён? — пытае.

— У шпіталі.

І зараз пазнала яго па голасе. Пасходзіліся суседзі, з'явілася на стол самагонка.

На другі дзень прыехаў я ў Чаромху, быў ужо вечар. Да-

рогі не знаю, пытаю работніка.

— Я вам не раджу ісці на Снежкі, — адказвае, — бо каля Пятроўшчыны банды ходзяць, можаце не дайсці.

Але я іду, збіўся з дарогі. Пабачыў святло, падышоў бліжэй, пачуў голас у хаце, пастукаў у дзверы. Усё адразу прапала, і голас, і святло. Я да другой хаты падаўся, дзе было святло. Там дзве жанчыны пралі на калаўротку. Яны на мяне, у вайсковай форме, вочы паставілі.

— Я сам з Дубна, — кажу ім, — ці можна ў вас перанагаваць?

Паслалі мне каля печы, каб нагрэўся, бо ў старых ботах быў, у мокрых шкарпэтках. Рана мне дарогу паказалі з Дашоў, бо туды я трапіў, у Пятроўшчыну, там мой знаёмы Ваня жыў. Знайшоў яго, ён акурат бульбу са склепа даставаў. Я пачакаў пакуль ён скончыць работу і ён завёз мяне ў Снежкі, да сваякоў. Яны пагасцілі мяне да вечара, прашу, каб завезлі мяне ў Дубна. Сваяк коней запрог і завёз. Было гэта 18 снежня.

На мой прыезд сышліся людзі. Прыйшоў і Малец, які ў Дубне жыў, бо яго бацькі ў Савецкі Саюз выехалі, і той, што талоны даваў, і іншыя.

## Ніна Панасюк, СТАРОЕ БЕРАЗОВА:

Так мы дайшлі з Прусіі ў Беласток. Там я адлучылася ад групы і асталася адна. Даведалася, які цягнік у Бельск едзе. Паціхеньку, каб ніхто не ўгледзеў, забралася ў каровячы вагон, прысела ў куточку быццам мыш і так даехала ў Бельск. З Бельска дзядзька завёз мяне ў суседнюю вёску Збуч, а адтуль дабралася пехатою ў роднае Старое Беразова. Не ведаю, прыйшла я ці прыляцела — ногі самыя неслі. Было 4 лютага 1945 года.

## Юлія Перавой, НАРОЙКІ:

Калі наступалі саветы, наша вёска не пацярпела. Але Сківі-Вялікія спалілі, бо нехта з забітага немца паліто сцягнуў.

Калі праходзіў фронт, я вярталася ад татавага брата, што ў Макарках жыў. Спынілі мяне немцы, я ім сказала, што малых дзяцей маю і адпусцілі мяне. Іду далей. Пераст-рэлка такая ўспыхнула, што мне пясок ад куляў у вочы сы-паўся. Зноў напаролася я на нямецкі самаход. Дапытва-юць мяне, што я раблю пад перастрэлкай. Забралі мяне ў той самаход і завезлі да дзядзькі ў Стаднікі, там яны сваю канцылярыю мелі. Праверылі, ці я ім праўду гаварыла; ма-быць падазравалі, што я варожай разведкай займаюся. Трымалі мяне тры дні, цукеркі і пернікі мне давалі. Не ад-пускалі, шкада дзяўчыны, гаварылі, бо фронт, хай сядзіць у дзядзькі. Пасля звольнілі, але асцерагалі перад мінамі.

## Ігнась Петручук, МІНСК:

Чырвоную Армію віталі ў нашай вёсцы Сацы хлебам і соллю. У нашай хаце стаяў штаб, жылі тэлефаністкі і, хаця вайна, смеху ў кватэры было многа. На нашым хля-ве стаяла антэна і немцы нас абстрэльвалі, а госці на-шы загадвалі нам хавацца пад ложак і адкрываць рот, каб слухавыя перапонкі не палопалі. Пасля салдаты спі-лавалі антэну і стральба спынілася.

Прыехала ваенная машына, усе старэйшыя хлопцы палезлі на яе. І я хацеў залезці, а ў той час машына па-дала назад, я ўпаў, адхіліў галаву перад колам і тое кола мне на бядро наехала і паламала. Павезлі мяне зразу ў Заблудаў або Беласток да польскага лекара. Ён быў п'яны і гіпсам туга абкрунуў мяне. Зараз зрабіўся ацёк нагі, пайшла ў стапу гангрэна, прыступілі невыносныя болі. Мама гэтага не сцярпела, паціху забрала мяне, брат разрэзаў гіпс і далечвалі мяне савецкія лекары. І пасля мяне лечылі ваенныя. Я тады малады быў і мо праз паў-тара месяца ўсё стала зажывацца.

## Вера Полех, КРУГЛЫ ЛЯСОК:

Саветы наступалі ад Бандароў, а немцы былі ў Сушчы, але адступілі на захад. Тады адзін снарад упаў у Круглы

Лясок, то шыбы ў вокнах павыпадалі. Іншыя снарады ўзрываліся за вёскай. Прыйшлі саветы, мелі ў нас акопвацца з гарматамі, але атрымалі загад наступаць далей і толькі ў Адрынках некалькі чалавек загінула. Пасля быў бой каля Плянтаў, лес пабіла, але вёска не згарэла. Было гэта пад вечар, мы за стог на лонку пахаваліся; трывала гэта мо з гадзіну і прайшло.

## Ян Сачко, ВУЛЬКА (каля Орлі):

Жыхары Вулькі пацярпелі ад немцаў у час савецкага наступлення. Яшчэ да надыходу фронту сяляне закапалі больш вартасныя прадметы і вопратку ў зямлі, выкапалі зямлянкі, у якіх намерваліся перачакаць ваенныя дзеянні. Немцы палічылі, што нехта з вяскоўцаў перарэзаў тэлефонны провад, якім перадавалі яны інфармацыю для артылерыйскага абстрэлу.

З-пад нашай вёскі немцы наглядалі за савецкімі войскамі, якія затрымаліся ў Спічках і па тэлефоне інфармавалі сваю артылерыю, што знаходзілася побач Галадоў, аб распалажэнні саветаў. Абстрэл Спічкоў быў дакладны і немцы раззлаваліся, калі нехта перарэзаў тэлефонны провад. Палічыўшы вінаватымі жыхароў нашай вёскі, забралі ў нас кароў і коней, што былі на лузе і ў хлявах, і пагналі іх у напрамку Бельска. Спачатку арыштавалі мужчын, але пасля жанчыны сталі немцам насіць яйкі, прасіць, каб адпусцілі мужоў дамоў і немцы зліталіся. Добра, што аставілі ў жывых людзей і не спалілі сяла. Наш бацька гнаў быдла пад наглядам немцаў. Удалося яму ўцячы па дарозе і вярнуцца дахаты. Дамоў вярнуліся толькі тыя каровы і коні, што ўцяклі са статка і ведалі дарогу да сваіх хлявоў.

Савецкія войскі абстрэльвалі Вульку, але знішчэнні былі невялікія. Калі Вульку занялі рускія салдаты, сталі рыхтавацца да абароны, што для сяла прадвяшчала трагедыю.

Саветы адразу прапанавалі нам уцякаць з вёскі, бо прадбачвалі абстрэл з пад Бельска. Частка людзей ра-

шылася ўцякаць перад нямецкім абстрэлам, але многія асталіся ў зямлянках, каб магчы гасіць будынкі на выпадак пажару. Абстрэл вёскі працягваўся некалькі дзён і быў настолькі моцны, што амаль на кожны панадворак упалі снарады. Адзін са снарадаў трапіў у суседскі хлеў і гной з драўнінай прысыпалі нашага суседа, што хаваўся збоку.

Я разам з іншымі дзяцьмі ўцёк у Міклашы, а пасля ў Крывятычы, а бацькі асталіся дома. Снарад упаў недзе пяцьдзесят метраў ад зямлянкі, у якой знаходзіліся мае сямейнікі разам з суседзямі, але не параніў ён людзей. Раніла затое савецкіх салдат, якія хаваліся ў хляве. Паранена была таксама жыхарка нашай вёскі. Абстрэл вёскі прынішчыў некалькі дамоў, крыху хлявоў і клуняў, але добра, што не ўспыхнуў пажар і ў агульным сяло ўцалела.

**Рыгор Стральчук, КРЫВАЯ:**

Як у 1944 годзе саветы завіталі да нас другі раз, бацьку адразу схапілі і вывезлі ў Сібір; тады з Крывой забралі сем чалавек. Спярша завезлі іх у Асташкаў, а адтуль бацька трапіў у Сталінагорск на Сібіры; працаваў там ва ўранавай шахце. Пасля расказваў, што было там каля пяці тысяч людзей: па тысячы літоўцаў і немцаў ды тры тысячы палякаў. У шахту не спускаўся толькі персанал лагернага шпіталя — польскай Паліклінікі Дзіцяткі Ісуса з Варшавы.

Тата папаўся туды як акавец: у той час саветы ўстанавілі для Беласточчыны пэўную норму затрымак акаўцаў, якую трэба было выканаць. Бацьку ўвогуле не судзілі, ён быў толькі „временно задержанным". Калі ў 1947 годзе з вычарпанай шахты выцягвалі на паверхню здабыўныя машыны, наступіў агромны ўзрыў. З тых пяці тысяч шахцёраў выратавалі, бадай, каля сямісот людзей. Тлумачылі, што ўзарваўся газ. Перад звальненнем усіх з Польшчы сагналі ў святліцу і заявілі: „Польская ўлада на-

столькі моцная, што можам вас адпусціць дамоў". Праз тыя чатыры гады пабыўкі бацькі ў шахце мы не мелі з ім ніякай сувязі.

Бацька вярнуўся ў Крывую позняй восенню 1948 года, але быў так абпраменены, такі слабы, што неўзабаве, бо ў 1951 годзе, памёр. Пасля вяртання намагаўся лячыцца ў тых урачоў, з якімі пазнаёміўся ў Сібіры. Калі сястра ездзіла ў Паліклініку Дзіцяткі Ісуса ў Варшаву, дык прафесар, які таксама быў у ссылцы, гаварыў, каб не называць прозвішча, толькі лагерны нумар; урачы гэтымі нумарамі карысталіся патайком. У гэтым не былі віноўныя саветы, толькі мясцовыя людзі.

## Міхал Тарасевіч, ГАЙНАЎКА:



Як мне расказала мама, калі насталі ў нас немцы, яны адразу — 22 верасня 1941 года — прыехалі ў нашу вёску Пасекі і загадалі перасяліцца. Наша сям'я пераехала ў Семяноўку да татавага швагра. У іх не было дзяцей, а хата вялікая — у адной яе палове размяшчалася школа. Пасля дзядзька прыняў яшчэ аднаго знаёмага і нам стала цесна. Тады тата з дзядзькам з нейкага хлява паставілі на дзядзькавым панадворку хацінку, у якой мы жылі да вызвалення. Помню ўжо добра, як прыходзілі да нас партызаны і нечага шукалі. А мы баяліся, бо ў Семяноўцы жылі таксама немцы, якія ахоўвалі мост на Нарве, праз які пралягала чыгуначная лінія з Гайнаўкі ў Свіслач.

Калі немцы сталі адступаць перад надыходзячым фронтам, мы рашылі прыхавацца ў Белавежскую пушчу. Помню, як увечар паклалі мы на фурманку пасцель і іншыя рэчы ды выехалі. У той час па чыгунцы ішоў паравоз з адным вагонам і рваў мост. Быў вялікі гук, які яш-

чэ сёння стаіць у маіх вушах.

Сядзелі мы на ўскраіне пушчы тры дні. Аднойчы раніцай адна жанчына зарэзала курыцу і зварыла суп. Мы сядзелі кружком і елі той суп, калі ў міску трапіў асколак ад міны; на шчасце нікому з нас нічога не сталася. Мы ўцяклі далей у пушчу, на паляну ў Кузьмін лес і там прасядзелі чарговых некалькі дзён. Наведалі нас партызаны, прасілі есці, і сказалі нам ад'ехаць яшчэ глыбей, бо мела быць вялікая перастрэлка. Заехалі мы ў 15-ы квартал і сталі пад вялікімі дубамі. Ноччу пайшоў праліўны дождж і, каб ад яго прыхавацца, нашы парабілі буды з яловага лубу. З сабою мелі мы карову і каня.

Далёка было чуваць выстралы гармат. Каля нас салдаты пракладалі правады і сказалі нам, што можна будзе вяртацца дадому, калі яны тыя правады знімуць. Праз два дні мы выехалі з лесу; я ехаў разам з дзядзькам і цёткай. Нейкіх трыста метраў перад Семяноўкай на дарозе ляжала мёртвая жанчына. У дзядзькавай хаце ляжаў труп савецкага салдата, а на стале была разабрана вінтоўка; відаць чысціў ён ружжо, калі за хатай узарваўся снарад і асколак забіў яго. У нашай хаціне на падлозе ляжала салома, відаць спалі на ёй салдаты, а на дне ў сагане асталося крыху маннай кашы; я тады ўпершыню паспрабаваў яе.

Калі фронт аддаліўся мы рашылі вяртацца ў Пасекі. Усё трэба было будаваць ад пачатку; у 1945–46 гадах была г.зв. свабода і за карыстанне лесам ніхто не караў. Я пайшоў у Семяноўку ў школу; хадзілі туды і малыя, і вялікія — было весела. Пасля заканчэння школы ў Семяноўцы я далей не вучыўся, бо не было на тое сродкаў ды і школ тады было мала.

## Ян Трахімчык, ГАРАДОК:

Здэмабілізавалі мяне ў снежні 1945 года. Маршал Ракасоўскі да нас прыехаў, далі нам *платье для жен*, цукар на дарогу, хлеб, эшалон падставілі. І нас на праверку

да дактароў і ў лазню яшчэ забралі. Вяртаемся, а нашых *вещей* няма ўжо; яны ўжо ў вагонах ляжалі. Паселі, зайграў аркестр і — дадому. Прыехалі ў Варшаву, з Варшавы ў Вільню і там нас распусцілі. Прыехалі мы ў Бераставіцу, а там поезд толькі раз у суткі ходзіць. Спаткаў я лётчыкаў і яны мяне ў Беласток бяруць. Паклікаў я хлопцаў і едзем. Прыехалі ў Гарадок. Я пісьмаў не даставаў і думаў, што нікога дома няма. Едзем па вуліцы, снег падае. Бачу: жонка ідзе ад кароў, малако нясе.

— Гражданка, — кажу я ёй, — можно посилится у вас?

— Нет, нет — адказвае.

Я за ёю іду, гутару, а яна не пазнае мяне. Пабачыў нас цесць:

— То ж то Ванька! — адразу пазнаў мяне.

Пазлазілі ўсе, хутка вестка пайшла. Кожная жонка гарэлку несла — тут вяселле зрабілі...

**Анатоль Храноўскі, ГАРАДОК:**

У 1944 годзе прыехалі і забралі мяне з савецкай у польскую армію. Назбіралі нас васемнаццаць чалавек і ў Люблін павезлі; адзін толькі я ваенны быў, а апошнія ў цывільным. У Любліне знялі з мяне савецкае адзенне, далі польскае і піханулі на Варшаву, на фронт. І ўжо мы Варшаву вызвалялі, якая яшчэ гарэла, а мы ў гумовых лодках на другі бераг перапраўляліся, каб немца разбіць; многа людзей тады загінула. Але тут ужо *ерунда*, а не вайна, была; там, на Ленінградскім фронце, то нямецкія самалёты нам давалі!

Вайна закончылася і нас у Лодзь адправілі самаходы і трактары будаваць. Пасля быў загад Жымерскага аб дэмабілізацыі. Мяне палкоўнік да сябе паклікаў і прапанаваў мне, каб я ішоў на тры гады ў Кракаў вучыцца.

— Пасля ў Маскву пойдзеш вучыцца, — гаварыў ён мне, — генералам будзеш! Ты зацярпеў і табе трэба даць добрую школу.

Я адмовіў і падаўся ў Гродзіск-Мазавецкі, пасля

ў Вроцлаў і Валбжых. Давалі мне *асадніцтва*, але я не схацеў і ў Гарадок вярнуўся. А тут усё спалена было, нікога не было. Я пасля вытрабаваў сям'ю з Савецкага Саюза. Вярнуліся ўсе, апрача сястры, якая ў Навагрудак замуж выйшла.

## Лідзія Юхімук, ТЫМЯНКА:



У Іркуцку *Акцябрскую* сустракалі. Адтуль вярталіся праз Харкаў, Кіеў і Брэст. Ніхто не думаў, што граніца ў Брэсце. Гавораць пра нейкую лінію Керзана, а я пра яе ніколі не чула.

Я і яшчэ дзесяць дзяўчат з *воинскими билетами* тыдзень у Брэсце правялі. Нас абакралі, есці няма за што купіць, няма куды дзецца. У пакой побач нашага нейкі начальнік прыходзіў; адна жанчына ў яго прыбірала. Я ёй расказала пра нашы клопаты і спытала, ці каб мо што таму начальніку дапамагчы, то мо ён нешта нам вырашыць. І яна зганула яму пра гэта. Паклікаў ён мяне, я яму расказала пра нашы клопаты. Ён сказаў, што ў яго на кватэры трэба крыху работы зрабіць, толькі *нельзя*. Але мы дамовіліся і вечарам я з сяброўкай пайшлі і пабялілі сцены ў ягонай кватэры, памылі падлогі. Ён даў нам есці і сказаў, каб зрабілі спісак нас усіх і раніцай толькі мы дзве ішлі за ім. У першых дзвярах будзе адзін вартаўнік стаяць, а ў другіх два...

Мы напісалі спісак на дзесяць асоб. Мяне ўстанавілі старшай. Пайшлі мы за нашым начальнікам побач вартаўнікоў і мне за тымі другімі дзвярамі далі спраўку. Вечарам селі мы на поезд, а ноччу граніцу пераехалі. У Чаромху прыехалі разам і адтуль раз'ехаліся.

На другі дзень прыйшла я ў Малочкі. Столькі людзей прыйшло на маё прывітанне, што ў пакоі не памесціліся і ў сенях стаялі. Пасля тата прыём усім блізкім наладзіў.